**© Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь**
**Установа адукацыі «Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў»**

**УВАГА!** *Фатаграфаванне, капіраванне і распаўсюджванне тэставага матэрыялу цягне за сабой адміністрацыйную адказнасць.*

## ДРТ–2026 г.

## Грамадазнаўства

*Варыянт змяшчае* 38 *заданняў і складаецца з часткі* А *(*16 *заданняў) і часткі* В *(*22 *заданні). На выкананне ўсіх заданняў адводзіцца* 90 *мінут. Будзьце ўважлівыя! Жадаем поспеху!*

### Частка А

*У заданнях часткі* А ***толькі адзін*** *з прапанаваных адказаў з'яўляецца правільным. У бланку адказаў пад нумарам задання пастаўце метку (×) у клетачцы, якая адпавядае нумару выбранага Вамі адказу.*

**А1. Паняцце, якое пайшло ад грэчаскага «мастацтва, майстэрства, уменне» і абазначае ўсю сукупнасць сродкаў, з дапамогай якіх чалавек уздзейнічае на прадмет працы ў працэсе вытворчай дзейнасці, – гэта:**

1) культура;
2) інавацыі;
3) навука;
4) прагрэс;
5) тэхніка.

**А2. Да агульных здольнасцей адносяцца:**

1) музыкальныя здольнасці;
2) тэхнічныя здольнасці;
3) разумовыя здольнасці;
4) мастацкія здольнасці;
5) спартыўныя здольнасці.

**А3. Іерархіі патрэб (ад ніжэйшых да больш высокіх), распрацаванай А. Маслоу, адпавядае ланцужок:**

1) фізіялагічныя патрэбы → імкненне да фізічнай бяспекі → імкненне да сацыяльных сувязей;
2) імкненне да сацыяльных сувязей → фізіялагічныя патрэбы → імкненне да фізічнай бяспекі;
3) фізіялагічныя патрэбы → патрэба ў самаактуалізацыі → імкненне да фізічнай бяспекі;
4) імкненне да фізічнай бяспекі → патрэба ў самаактуалізацыі → імкненне да сацыяльных сувязей;
5) імкненне да грамадскай павагі і прызнання → патрэба ў самаактуалізацыі → імкненне да фізічнай бяспекі.

**А4. Да вертыкальнай сацыяльнай структуры адносіцца такая сацыяльная група, як:**

1) беларусы;
2) сярэдні клас;
3) хрысціяне;
4) жанчыны;
5) непаўналетнія.

**А5. У Рэспубліцы Беларусь перапіс насельніцтва праводзіўся ў:**

1) 1994 г.;
2) 2021 г.;
3) 2011 г.;
4) 2019 г.;
5) 2022 г.

**А6. У структуру маралі ўваходзяць:**

1) веды і перажыванні;
2) факты і адчуванні;
3) пачуцці і эмоцыі;
4) вопыт і практыка;
5) каштоўнасці і нормы.

**А7. Выберыце варыянт адказу, абодва элементы якога з’яўляюцца характарыстыкамі філасофіі:**

| | |
|---|---|
| **а)** апора на лагічна абгрунтаваныя веды<br>**б)** абмежаванасць дагматамі, г. зн. палажэннямі, якія не падлягаюць сумненню і крытыцы<br>**в)** пабудова сістэм светатлумачэння на рацыянальнай аснове<br>**г)** адсутнасць унутранай свабоды і зварот да аўтарытэтаў<br>**д)** выкарыстанне толькі слоў натуральнай, паўсядзённай мовы, без дакладна вызначанага зместу | **1)** а, г<br>**2)** а, в<br>**3)** г, д<br>**4)** б, в<br>**5)** б, г |

**А8.** *Прафесійны фатограф Андрэй купіў новы фотаапарат, які ён зараз актыўна выкарыстоўвае ў сваёй працы.* **Дадзены прыклад ілюструе такую форму прыватнай уласнасці, як:**

1) кааператыўная;
2) акцыянерная;
3) індывідуальная;
4) долевая;
5) асабістая.

**А9. Спаборнасць, саперніцтва паміж эканамічнымі суб’ектамі за найбольш выгадныя ўмовы вытворчасці і/ці рэалізацыі тавараў і паслуг, за выжыванне і эканамічны росквіт – гэта:**

1) крэдытаванне;
2) канкурэнцыя;
3) дэпазіт;
4) лізінг;
5) дэнамінацыя.

**А10. Сукупнасць метадаў уздзеяння дзяржавы на вытворчасць з мэтай стварэння новых тэхналогій і выпуску новых відаў прадукцыі, а таксама пашырэння рынкаў збыту айчынных тавараў – гэта:**

1) нацыянальная палітыка;
2) культурная палітыка;
3) канфесійная палітыка;
4) інавацыйная палітыка;
5) дэмаграфічная палітыка.

**А11. Выберыце правільны варыянт запаўнення схемы.**

**АСНОЎНЫЯ ПАЛІТЫЧНЫЯ ІДЭАЛОГІІ**

| **Класічны лібералізм** | **Класічны кансерватызм** | **Класічны сацыялізм** |
|---|---|---|
| Назва ад лац. **А)__________** | Назва ад лац. «захоўваць» | Назва ад лац. «грамадскі» |
| Засноўваецца на ідэях індывідуалізму, свабоды асобы, абароны прыватнай уласнасці і рыначнай эканомікі | Засноўваецца на ідэях традыцыяналізму і недатыкальнасці прыватнай уласнасці, выступае супраць рэвалюцыйных пераўтварэнняў | **Б)__________** |

1) А – «карэнны», Б – засноўваецца на ідэі неўмяшання дзяржавы ў эканоміку;
2) А – «свабодны», Б – засноўваецца на ідэях калектывізму, грамадскай уласнасці і сацыяльнай роўнасці;
3) А – «адзінаўладдзе», Б – засноўваецца на традыцыйных каштоўнасцях (сямейных, манархічных, рэлігійных і інш.);
4) А – «народаўладдзе», Б – засноўваецца на ідэях калектывізму, грамадскай уласнасці і сацыяльнай роўнасці;
5) А – «частка», Б – засноўваецца на ідэі неўмяшання дзяржавы ў эканоміку.

**А12. Прыкладам грамадскага аб’яднання ў Рэспубліцы Беларусь з’яўляецца:**
1) Беларускі прафесійны саюз работнікаў аховы здароўя;
2) Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь;
3) Зэльвенскі раённы Савет дэпутатаў;
4) Маладзечанскі раённы выканаўчы камітэт;
5) Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь.

**А13. Кіраўніцкім правам называюць:**
1) грамадзянскае права;
2) прыватнае права;
3) адміністрацыйнае права;
4) канстытуцыйнае права;
5) крымінальнае права.

**А14. Адной з умоў набыцця грамадзянства Рэспублікі Беларусь па нараджэнні з’яўляецца:**
1) веданне дзяржаўных моў Рэспублікі Беларусь;
2) пастаяннае пражыванне на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;
3) дасягненне ўзросту 19 гадоў;
4) наяўнасць у аднаго ці абодвух бацькоў дзіцяці грамадзянства Рэспублікі Беларусь;
5) выкананне Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

**А15. Выберыце правільнае сцверджанне.**
1) У Рэспубліцы Беларусь адным з прынцыпаў выбарчага права з’яўляецца тайнае галасаванне.
2) Для Рэспублікі Беларусь характэрна прапарцыянальная выбарчая сістэма.
3) У Рэспубліцы Беларусь для таго, каб атрымаць права выбіраць, дастаткова мець грамадзянства Рэспублікі Беларусь.
4) Крымінальны кодэкс Рэспублікі Беларусь з’яўляецца асноўным дакументам, у якім замацаваны прынцыпы выбарчага права.
5) У Рэспубліцы Беларусь выбары праходзяць на аснове ўсеагульнага, няроўнага і ўскоснага выбарчага права.

**А16. У адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь як правам, так і абавязкам бацькоў з’яўляецца:**
1) асабістае валоданне ўласнасцю, атрыманай у дар;
2) утрыманне паўналетніх дзяцей;
3) заключэнне шлюбнага дагавора;
4) прадастаўленне ўтрымання мужу або жонцы;
5) выхаванне сваіх дзяцей.

## Частка В

*Адказы, атрыманыя пры выкананні заданняў часткі* В, *запішыце ў бланку адказаў. Кожную літару, лічбу пішыце ў асобнай клетачцы (пачынаючы з першай) па ўзорах, указаных у бланку. Адказ у выглядзе слова, некалькіх слоў пішыце без прабелаў, злучка або іншых раздзяляльных знакаў.*

*У заданнях* **В1−В3** *дапоўніце сказ. Адказ запішыце* ***СЛОВАМ*** *у той форме, у якой яно павінна быць выкарыстана ў сказе.*

**В1.** Паняцце, якое паходзіць ад лацінскага слова «спавяданне» і абазначае асобныя напрамкі ў рамках адной рэлігіі, асаблівасці веравызнання ў межах пэўнага рэлігійнага вучэння, – гэта _________.

**В2.** Найважнейшы закон рыначнага ўзаемадзеяння, згодна з якім пры павелічэнні цаны на тавар змяншаецца колькасць тавару, якую спажыўцы гатовы набыць, – гэта закон ________.

**B3.** Паняцце, якое абазначае:
**а)** цэнтральны інстытут палітычнай сістэмы;
**б)** асаблівую форму арганізацыі палітычнай улады, якая валодае адмысловым апаратам кіравання грамадствам для забеспячэння яго цэласнасці, арганізаванасці і пэўнага парадку ў ім, – гэта _________.

*У заданні* **B4** *адказ запішыце* ***ЛІЧБАЙ****. Напрыклад:* **1**.

**B4. Выберыце з указаных сацыяльных працэсаў той, які адбыўся РАНЕЙ за іншыя:**
**1)** прамысловая рэвалюцыя; **2)** аграрная рэвалюцыя; **3)** навукова-тэхнічная рэвалюцыя.

*У заданні* **B5** *адказ запішыце* ***ЛІЧБАМІ****, захоўваючы атрыманую паслядоўнасць. Напрыклад:* **123**.

**B5. Размясціце ўказаныя дакументы па правах дзіцяці ў храналагічнай паслядоўнасці (ад прынятага раней да прынятага пазней):**
**1)** Канвенцыя аб правах дзіцяці, прынятая Генеральнай Асамблеяй ААН;
**2)** Закон Рэспублікі Беларусь «Аб правах дзіцяці»;
**3)** Дэкларацыя правоў дзіцяці, прынятая Лігай Нацый.

*У заданнях* **B6–B13** *адказ запішыце* ***ЛІЧБАМІ*** *(парадак запісу лічбаў не мае значэння, колькасць лічбаў у адказе ва ўказаных заданнях можа адрозніваецца). Напрыклад:* **12** *або* **153**.

**B6. Адзначце характарыстыкі планавай эканомікі:**
**1)** кіраванне эканомікай поўнасцю вызначаецца звычаямі і традыцыямі;
**2)** заахвочваецца свабода прадпрымальніцкай дзейнасці;
**3)** пануе дзяржаўная ўласнасць на сродкі вытворчасці;
**4)** усе пытанні эканомікі вырашаюцца пры дапамозе рынавых механізмаў;
**5)** дамінуе дырэктыўнае размеркаванне;
**6)** прысутнічае цэнтралізаванае планаванне.

**B7. Адзначце праявы такога прынцыпу міжнароднага права, як суверэнная роўнасць дзяржаў:**
**1)** наяўнасць ва ўсіх дзяржаў аднолькавых правоў у міжнародных адносінах;
**2)** самастойнасць дзяржаў у вырашэнні пытанняў іх удзелу ў міжнародных арганізацыях;
**3)** наяўнасць у дзяржавах гарантый ажыццяўлення правоў чалавека;
**4)** наяўнасць ва ўсіх дзяржаў аднолькавых абавязкаў у міжнародных адносінах;
**5)** вырашэнне супярэчнасцей, якія ўзнікаюць паміж дзяржавамі, мірнымі сродкамі;
**6)** непрымяненне сілы ці пагрозы сілай.

**B8. Адзначце суб’екты сістэмы гарантавання нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь:**
**1)** дзяржаўныя органы;
**2)** тэрыторыя;
**3)** грамадскія аб’яднанні;
**4)** грамадзяне;
**5)** суверэнітэт;
**6)** Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь.

**B9. Адзначце прыклады паўнацэнных грошай:**
**1)** манеты з каштоўных металаў;
**2)** папяровыя грошы;
**3)** манеты з некаштоўных металаў;
**4)** таварныя грошы;
**5)** банкаўскія карткі.

**В10. Выберыце правільныя сцверджанні.**




**Згодна з данымі дыяграмы ў Рэспубліцы Беларусь:**

**1)** У 2014 г. колькасць помнікаў археалогіі, уключаных у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей, была меншай, чым колькасць помнікаў архітэктуры, уключаных у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей.

**2)** З 2017 па 2020 г. колькасць помнікаў мастацтва, уключаных у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей, не змянілася.

**3)** У 2014 г. колькасць помнікаў гісторыі, уключаных у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей, была большай, чым колькасць помнікаў архітэктуры, уключаных у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей.

**4)** З 2014 па 2020 г. колькасць помнікаў гісторыі, уключаных у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей, зменшылася.

**5)** У 2017 г. колькасць помнікаў археалогіі, уключаных у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей, была большай, чым у 2020 г.

**В11. Выберыце правільныя сцверджанні, якія характарызуюць паспяховыя зносіны.**

**1)** Найважнейшым прынцыпам паспяховых зносін з’яўляецца разуменне сітуацыі зносін, г. зн. кантэксту.

**2)** Прынцып зваротнасці з’яўляецца асновай этыкету.

**3)** Выкарыстанне слэнгу спрашчае паўсядзённае ўзаемадзеянне паміж носьбітамі гэтага слэнгу.

**4)** Тактоўнасць, г. зн. унутраная ўпэўненасць асобы ва ўласнай каштоўнасці, вельмі важная для паспяховых зносін.

**5)** Выкарыстанне слэнгу па-за межамі той групы, дзе ён быў сфарміраваны, заўсёды паляпшае ўзаемаразуменне з навакольнымі.

**6)** Добрае разуменне кантэксту зносін магчыма пры ўмове працяглага ўдзелу людзей у сумеснай дзейнасці.

**B12. Выберыце правільныя сцверджанні, якія характарызуюць Парламент Рэспублікі Беларусь.**

1) Парламент Рэспублікі Беларусь з’яўляецца кантрольна-наглядным органам краіны.
2) Заканадаўчая ўлада ў Рэспубліцы Беларусь прадстаўлена Парламентам.
3) Парламент Рэспублікі Беларусь называецца Саветам Рэспублікі.
4) Парламент Рэспублікі Беларусь з’яўляецца прадстаўнічым органам улады.
5) У склад Палаты прадстаўнікоў Парламента Рэспублікі Беларусь уваходзяць дэпутаты, абраныя ў выніку прамых выбараў.
6) Урад Рэспублікі Беларусь ажыццяўляе кантроль за дзейнасцю Парламента.

**B13. Выберыце правільныя сцверджанні, якія характарызуюць маральныя асновы навукі.**

1) З праблемай маральных асноў навукі шчыльна звязана праблема адказнасці вучонага перад грамадствам.
2) Прынцып арганізаванага скептыцызму азначае, што вучоныя павінны крытычна ставіцца да выказаных ідэй, у тым ліку і сваіх уласных.
3) Прынцып універсалізму азначае, што ацэнка любой навуковай ідэі павінна залежаць ад навуковага аўтарытэту і сацыяльнага статусу яе аўтара.
4) Прынцып агульнасці азначае, што адзіным уладальнікам вынікаў навуковых даследаванняў з’яўляецца вучоны, які іх праводзіў.
5) Прынцып бескарыслівасці азначае, што вучоны ў першую чаргу павінен імкнуцца да пошуку ісціны, а не атрымання асабістай карысці.
6) Іванам Паўлавым былі сфармуляваны чатыры базавыя прынцыпы, якімі павінны кіравацца вучоныя ў сваёй даследчай дзейнасці.

*У заданнях* **B14–B16** *адказ запішыце ў выглядзе* ***СПАЛУЧЭННЯ ЛІТАР І ЛІЧБАЎ****, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар верхняга рада. Напрыклад:* **А1Б6В4**.

*Памятайце, што некаторыя даныя ніжняга рада могуць не выкарыстоўвацца.*

**B14. Устаўце ў прыведзеным тэксце на месцы пропускаў словы (словазлучэнні) з прапанаванага спіса, якія падыходзяць па сэнсе. Выбірайце словы (словазлучэнні) паслядоўна, мысленна ўстаўляючы іх у патрэбнай форме.**

Медыятэксты – гэта паведамленні, тэксты, створаныя ў розных відах і жанрах медыя. Кожны медыятэкст утрымлівае **А)** ________, г. зн. пэўнае пасланне, галоўную ідэю, пасыл, які закладваюць яго стваральнікі. Прыватнае паведамленне становіцца медыятэкстам, **Б)** ________. Медыя амаль імгненна дастаўляюць інфармацыю ў любую кропку свету. **В)** __________ з’яўляецца мэтавая аўдыторыя

| | | |
|---|---|---|
| **1)** адрасат медыя | **3)** артэфакт | **5)** як толькі яно апублікавана |
| **2)** меседж | **4)** стваральнік медыя | **6)** як толькі яно задумана |

**B15. Устаўце ў прыведзеным тэксце на месцы пропускаў словы (словазлучэнні) з прапанаванага спіса, якія падыходзяць па сэнсе. Выбірайце словы (словазлучэнні) паслядоўна, мысленна ўстаўляючы іх у патрэбнай форме.**

У адпаведнасці з працоўным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь работнік, які заключыў працоўны дагавор на няпэўны тэрмін, мае права скасаваць яго па ўласным жаданні, папярэдзіўшы пра гэта наймальніка пісьмова не пазней чым за **А)** ________. Па пагадненні бакоў працоўны дагавор **Б)** ________ быць скасаваны да заканчэння тэрміну папярэджання. Спыненне працоўнага дагавора афармляецца **В)** ________, што з’яўляецца падставай для разліку з работнікам і занясення запісу ў працоўную кніжку

| | | | |
|---|---|---|---|
| **1)** вусная згода работніка | **3)** загад наймальніка | **5)** 1 месяц | **7)** можа |
| **2)** 6 месяцаў | **4)** 3 месяцы | **6)** не можа | **8)** указ Кіраўніка дзяржавы |

**B16. Устаўце ў прыведзеным тэксце на месцы пропускаў словы (словазлучэнні) з прапанаванага спіска, якія падыходзяць па сэнсе. Выбірайце словы (словазлучэнні) паслядоўна, мысленна ўстаўляючы іх у патрэбнай форме.**

| | | |
|---|---|---|
| Існуе мноства азначэнняў паняцця «сям'я». Аднак большасць навукоўцаў пад сямейнымі адносінамі разумеюць шлюб, **А)** ________, сваяцтва. Сям'я як **Б)** ________ сацыяльная група ўяўляе сабой нефармальнае аб'яднанне людзей. З пункту гледжання закону шлюбныя адносіны прызнаюцца дзяржавай толькі **В)** ________ | | |
| **1)** каханне | **3)** малая | **5)** у выпадку іх рэгістрацыі |
| **2)** вялікая | **4)** бацькоўства | **6)** у выпадку сумеснага пражывання |

*У заданні* **B17** *адказ запішыце* ***ЛІЧБАМІ****, парадак запісу лічбаў не мае значэння. Напрыклад:* **12**.

**B17. Адзначце сказы, у якіх дапушчана сэнсавая памылка. Звярніце ўвагу: неабходна адзначыць НЯПРАВІЛЬНЫЯ сцверджанні!**

**1)** Адукацыя – гэта мэтанакіраваны працэс навучання і выхавання, які ажыццяўляецца на прафесійнай аснове спецыяльна падрыхтаванымі людзьмі. **2)** Пад выхаваннем разумеюць дзейнасць, асноўнай мэтай якой з'яўляецца засваенне навучэнцамі ведаў, уменняў і навыкаў. **3)** Навучанне ўяўляе сабой працэс, галоўнай мэтай якога з'яўляецца фарміраванне ў навучэнцаў каштоўнасцей, светапогляду, асобасных якасцей. **4)** Кожная гістарычная эпоха выбудоўвала такую сістэму адукацыі, якая не толькі абапіралася на дасягнуты да гэтага часу ўзровень ведаў, але і адпавядала мэтам развіцця грамадства. **5)** У развітых сістэмах адукацыі навучанне і выхаванне з'яўляюцца непарыўнымі кампанентамі адзінага цэлага. **6)** Права на адукацыю адносіцца да найважнейшых правоў чалавека.

*У заданнях* **B18–B21** *адказ запішыце ў выглядзе* ***СПАЛУЧЭННЯ ЛІТАР І ЛІЧБАЎ****, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Напрыклад:* **А1Б3В4**.

*Памятайце, што некаторыя варыянты, прапанаваныя ў правым слупку, могуць не выкарыстоўвацца.*

**B18. Устанавіце адпаведнасць.**

| Паняцце | Навуковец, які ўвёў у навуковы ўжытак дадзенае паняцце |
|---|---|
| **А)** стэрэатып | **1)** Агюст Конт |
| **Б)** сацыяльны інстытут | **2)** Уолтэр Ліпман |
| **В)** сацыялогія | **3)** Макс Вебер |
| | **4)** Герберт Спенсер |

**B19. Устанавіце адпаведнасць.**

| Паняцце | Азначэнне |
|---|---|
| **А)** вытрымка | **1)** здольнасць чалавека рабіць захады для рэалізацыі ідэй, што ў яго ўзніклі |
| **Б)** ініцыятыўнасць | **2)** унутраны псіхічны працэс, які працякае ў форме перажыванняў і адлюстроўвае значнасць знешніх і ўнутраных сітуацый для чалавека |
| **В)** паслядоўнасць | **3)** уменне кантраляваць свае эмоцыі і пачуцці, пазбягаць імпульсіўных, неабдуманых дзеянняў |
| | **4)** схільнасць неадступна кіравацца чым-небудзь, ажыццяўляць дзеянні, якія бесперапынна ідуць адно за другім |

**В20. Устанавіце адпаведнасць.**

| Прававы інстытут | Функцыя |
|---|---|
| **А)** адвакатура<br>**Б)** натарыят<br>**В)** медыяцыя | **1)** засведчанне здзелак і наданне юрыдычнай сілы розным дакументам (дагаворы, завяшчанні, даверанасці і г. д.)<br>**2)** вядзенне перагавораў бакоў з удзелам нейтральнай асобы ў мэтах урэгулявання спрэчкі шляхам выпрацоўкі ўзаемапрымальнага для ўдзельнікаў пагаднення<br>**3)** ажыццяўленне нагляду за дакладным і аднастайным выкананнем нарматыўных прававых актаў<br>**4)** аказанне юрыдычнай дапамогі ў мэтах ажыццяўлення і абароны правоў, свабод і інтарэсаў фізічных і юрыдычных асоб; удзел у крымінальным судаводстве ў якасці абаронцы |

**В21. Устанавіце адпаведнасць.**

| Паняцце | Азначэнне |
|---|---|
| **А)** злачынства<br>**Б)** пакаранне<br>**В)** прэзумпцыя невінаватасці | **1)** сукупнасць аб’ектыўных і суб’ектыўных прымет злачынства пэўнага віду<br>**2)** мера крымінальнай адказнасці, якая прымяняецца па прыгаворы суда да асобы, асуджанай за злачынства, і якая заключаецца ў прадугледжаных законам пазбаўленні або абмежаванні правоў і свабод асуджанага<br>**3)** здзейсненае вінавата (наўмысна ці па неасцярожнасці) і супрацьпраўна грамадска небяспечнае дзеянне (дзеянне ці бяздзеянне), якое забаронена законам пад пагрозай пакарання<br>**4)** акалічнасці, якія сведчаць пра значнае зніжэнне ступені грамадскай небяспекі здзейсненага злачынства і асобы вінаватага<br>**5)** адзін з прынцыпаў крымінальнага судаводства, які заключаецца ў тым, што асоба лічыцца невінаватай, пакуль яе віна ў здзейсненым злачынстве не будзе даказана ў парадку, прадугледжаным законам, і ўстаноўлена прыгаворам суда, які ўступіў у законную сілу |

*У заданні* **В22** *адказ запішыце ў выглядзе* ***СПАЛУЧЭННЯ ЛІТАР І ЛІЧБАЎ****, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка, парадак запісу лічбаў не мае значэння. Напрыклад:* **А12Б34**.

*Памятайце, УСЕ варыянты, прапанаваныя ў правым слупку, павінны быць выкарыстаны.*

**В22. Устанавіце адпаведнасць.**

| Від падатку | Характарыстыка |
|---|---|
| **А)** прамыя падаткі<br>**Б)** ускосныя падаткі | **1)** выплачваюцца апасродкавана<br>**2)** спаганяюцца непасрэдна з даходаў падаткаплацельшчыкаў<br>**3)** уключаюць падатак на прыбытак<br>**4)** выплачваюцца шляхам уключэння ў цану тавараў і паслуг |